■ Фестывалім!

# Да канцэртаў — гатовы

## Праграма на вершы Купалы і Коласа, юбілей «Сяброў» і выступленні сучасных паэтаў

**2 і 3 чэрвеня пройдзе XVII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017». Гэта адзінае свята, што мае такі статус: усе творы выконваюцца на нацыянальнай мове. Яскравы конкурс маладых выканаўцаў, выступленне Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі, а таксама праграма, створаная спецыяльна да 135-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа, — вось асноўнае, чым сёлета будзе здзіўляць любімы фестываль.**

— Канцэрты пройдуць пад знакам адной з галоўных падзей у культурным жыцці гэтага года — 135-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гэтым юбілеем, тэмай творчасці песняроў будуць прасякнуты ўсе фестывальныя мерапрыемствы, — адзначыла **першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына ДРЫГА.** — Адкрыецца фестываль галоўнай падзеяй — конкурсам маладых выканаўцаў эстраднай песні. 2 чэрвеня пройдуць адразу два туры. Падчас апошняга яны выканаюць песні ў суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга на сцэне летняга амфітэатра Маладзечна.

На вечаровым канцэрце-адкрыцці адбудзецца падвядзенне вынікаў конкурсу. А таксама будзе прэзентавана зусім новая праграма — «Купала і Колас. Вы нас гадавалі», аўтарам і складальнікам якой з'яўляецца Міхаіл Фінберг. У ёй будуць і знаёмыя публіцы творы, напісаныя на словы гэтых паэтаў, і абсалютна новыя, якія прэзентуюць упершыню. Завершыцца першы дзень святочным салютам.

Вельмі насычанай чакаецца і праграма другога дня фестывалю — адбудзецца канцэрт акадэмічнай музыкі ў дзіцячай музычнай школе. Штогод там прэзентуюць маладзёжныя творы мінулых эпох — кампазітараў XVII, XVIII і XIX стагоддзяў. У гэты ж дзень артысты фестывалю выступяць у вёсцы Чысць. Канцэрт-закрыццё прымеркаваны да юбілею ансамбля «Сябры». Яго вядучым будзе народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка.

— Падтрымліваць высокі ўзровень нацыянальнага фестывалю зусім няпроста, — разважае **мастацкі кіраўнік — дырэктар**



**Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі Міхаіл ФІНБЕРГ.** — Некаторыя аўтары забараняюць выконваць свае творы — і гэта надзвычай прыкра. Але мы працуем на карысць нашай роднай Бацькаўшчыны. Няма такога кутка ў Беларусі, дзе ні пабываў бы наш аркестр. Нядаўна мы вярнуліся з Вілейкі, там распачалі новы цудоўны фестываль у касцёле... Ужо рэпеціравалі праграму на творы Купалы і Коласа, якую адыграем на фестывалі песні і паэзіі, — атрымалася вельмі каларытна.

Пра тое, што ў Маладзечне ўсіх гасцей сустрэнуць з традыцыйнай гасціннасцю, расказала **дырэктар Палаца культуры Маладзечна Святлана САРОКА:**

— Горад гатовы да фестывалю: зроблена афармленне, падрыхтаваныя асноўныя ўстановы, у якіх будуць праходзіць мерапрыемствы, а таксама канцэртныя пляцоўкі. Цяпер ідзе вялікая работа з рэжысёрамі і пастаноўшчыкамі. Нам надзвычай прыемна вітаць у сябе творчую эліту Беларусі — паэтаў, кампазітараў, выканаўцаў — адбудзецца шмат добрых і цёплых сустрэч. Прымуць актыўны ўдзел народныя ўзорныя калектывы, лепшыя творцы. Распачнецца фестываль нават раней за 2 чэрвеня — з 31 мая ў нас пачнуць праходзіць прэзентацыі і сустрэчы з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Другі год працуе афіцыйны сайт фестывалю, падкрэсліла Святлана Сарока, на ім можна знайсці ўсю актуальную інфармацыю — festival.by.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# АЗІМЫЯ ЗАМАРАЗКАЎ АМАЛЬ НЕ СПУЖАЛІСЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

На пасевах азімага жыта, пшаніцы і трыцікале адзначаецца фаза «выхад у трубку», але з-за нізкіх начных тэмператур паменшылася інтэнсіўнасць паступлення і засваення раслінамі азоту, што неспрыяльна адбіваецца на развіцці раслін. «У перыяд трубкавання фарміруюцца такія важныя складальнікі ўраджаю, як даўжыня коласа, колькасць каласкоў у ім. Недахоп азоту ў гэты час прыводзіць да ападнення ніжніх каласкоў. Для забеспячэння добрай урадлівасці азімых збожжавых неабходна правесці другую падкормку азотнымі ўгнаеннямі», — падкрэсліў Эрома Урбан. А яшчэ эксперт лічыць, што сёння стан пасеваў азімага рапсу ацэньваецца як добры і здавальняючы, каля 90% пасяхова перанесла замаразкі.

У сваю чаргу, **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ЯДЛОЎСКІ** паведамляе, што сёлета ўзімку былі спрыяльныя ўмовы для азімых культур, таму гібель пасеваў у параўнанні з мінулым годам невялікая. «Гібель пасеваў азімых збожжавых культур склала ўсяго 0,6% ад пасеянай плошчы, страта азімага рапсу — 11,5%, — удакладніў ён. — Гэта амаль у межах дапушчальных аб'ёмаў. Таму спадзяёмся, што ў гэтым годзе мы атрымаем больш рапсу на зерне і больш загрузім свае перапрацоўчыя магутнасці і забяспечым жывёлагадоўлю».

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ФАКТАР

Таксама Васіль Ядлоўскі паведаміў, што цяпер практычна завершана сяўба ранніх яравых збожжавых культур. Паводле яго слоў, такая сяўба сёння завершана ў тым ліку і ў Віцебскай вобласці, дзе пераўвільгатненне глебы запавольвала ход палявых работ. «Спачатку ранняя вясна дала нам большы запас часу для палявых работ. Але халоднае надвор'е ў канцы красавіка — пачатку мая разам з багатымі ападкамі, асабліва па паўночным усходзе, прывяло да запаволення тэмпаў пасяўных работ і развіцця культур. Цяпер толькі збіраецца аператыўная інфармацыя аб тым, як пацярпелі яравыя культуры ад вясновых замаразкаў, але мы ўжо ведаем, што гібель яравых культур нязначная. Яшчэ рана казаць пра тое, як паўплываюць вясновыя замаразкі на ўраджай, але мы пакуль не прагназуем істотнага зніжэння аб'ёмаў ураджаю з-за нізкіх тэмператур. Больш за ўсё нас турбуе арганізацыйны фактар, калі не вытрымліваюцца тэмпы палявых работ з прычыны пераўвільгатнення глебы. З-за гэтага адбываюцца самыя вялікія страты», — сказаў Васіль Ядлоўскі.

## ЦВІЦЕННЕ САДОЎ БЕЗ ГУДЗЕННЯ ПЧОЛ

А яшчэ спецыяліст паведаміў, што з-за вясновых замаразкаў пацярпелі пладовыя і ягадныя культуры. «У канцы красавіка — пачатку мая пупышкі сталі пашкоджвацца з-за халадоў. Цвіценне садоў пачалося ў першай дэкадзе мая, але з-за халоднага надвор'я не будзе той прагназаванай ураджайнасці, на якую мы маглі б разлічваць. Пацярпелі і ягадныя культуры — дурніцы, парэчкі і іншыя», — дадаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення. Каб у садах і ягадных культурах быў добры ўраджай, пад час цвіцення неабходна сур'ёзная актыўнасць насякомых-апыляльнікаў. А ў халоднае надвор'е пчолы амаль не лятаюць.

Акрамя таго, са спазненнем ідзе развіццё кармавых культур. Касавіцу планавецца пачаць на 5—6 дзён пазней, чым у мінулым годзе.

## ЦЁПЛЫЯ НОЧЫ — НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Спрыяльнае для палявых работ надвор'е чакаецца ў другой палове мая, паведаміла **намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ.**

У найбліжэйшы час сіноптыкі ўвогуле не чакаюць неспрыяльных умоў надвор'я для аграрыяў. Дзённыя тэмпературы складуць больш за 20 градусаў вышэй за нуль. На гэтым тыдні — апошнія начныя замаразкі, а далей начныя тэмпературы будуць павольна павышацца.

Паводле слоў **намесніка начальніка службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета Надзеі МЕЛЬЧАКОВАЙ,** маштабных пашкоджанняў сельскагаспадарчых культур ад вясновых замаразкаў не адзначана. «Мы часткова турбуемся за азімы рапс, пладовыя дрэвы. З-за халадоў стрымліваліся тэмпы пасадкі бульбы і пасеву кукурузы. Але ў сувязі з павышэннем тэмпературы і ўсталяваннем сонечнага надвор'я ў найбліжэйшы час умовы для гэтых работ будуць спрыяльныя. На гэтым тыдні будзе цёплае сухое надвор'е, аднак магчыма, што ў канцы мая да нас завітаюць дажджы», — адзначыла яна.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

| Наименование продавца (балансодержателя) | № лота | Наименование объекта торгов, краткие характеристики | Местонахождение | Условия продажи | Начальная цена продажи, без учета НДС, BYN | Задаток, BYN |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ОАО «Малоритский консервно-овощесушильный комбинат» | 1 | Незавершенный законсервированный цех плодоовощных консервов для детского питания с инв. №103/U-9173, общ. пл. 5047,0 м², расположенный на земельном участке пл. 1,0702 га с кадастровым номером 125250100001002660 | Брестская обл., г. Малорита, ул. Заводская, 9А | с условиями | 23,00 | 1 248,00 |
| | 2 | Капитальное строение (инв. №142/С-10969), общ. пл. 647,2 м² – здание котельной, расположенное на земельном участке пл. 0,3085 га с кадастровым номером 125250100001000205. В состав капитального строения входит забор (ж/б плиты, сетка-рабица, кирпич), протяж. 180 м п. | Брестская обл., г. Малорита, ул. Лермонтова, 16Б | без условий | 18 528,35 | 1 852,84 |
| Организатор торгов | | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | | |
| Условия оплаты | | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | | 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10. УНП 201028245 | | | | |

**Аукцион состоится 9 июня 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 8 июня 2017 г. до 17.00

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА 1100291 считать недействительным

## ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 192400611

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова. Жилой дом №14 по генплану»,** опубликованную в газете «Звязда» №69 (28179) от 14.04.2016.

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – май 2017 года.

Директор А.А. Угначев

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства объектов (микрорайон «Ольшанка-2», ул. Болдина) в городе Гродно 13 июня 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Перекресток улицы Болдина и «Тропы здоровья» | 0,2102 | 440100000002002102 | 126 957,43 | 12 000 | 3 020,6 | Строительство объекта общественного питания (с открытой террасой) – кафе на 30-50 мест |
| 2* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Южный-2» («Ольшанка-2») поз. по генплану №105 | 0,7866 | 440100000001008878 | 153 831, 55 | 15 000,0 | 3 020, 6 | Строительство торгового объекта с объектом общественного питания |

* - возможно изменение целевого назначения земельного участка с внесением изменений в градостроительный паспорт объекта в соответствии с решением Гродненского городского исполнительного комитета от 09.03.2017 г. № 132 «Об определении Перечня земельных участков для разработки градостроительных паспортов и внесении изменений в решения Гродненского городского исполнительного комитета».

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года - гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 13 июня 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 15 мая по 7 июня 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**